Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 2 (48) 2006

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

Змест

Галоўны рэдактар:
П. Дз. Кухарчык

Рэдакцыйная калегія:
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

Гісторыя

Бушчык Г. П. Выкарыстанне германскіх рэпарацый для аднаўлення Мінска пасля Вялікай Айчыннай вайны 3

Столяр Дз. М. Асноўныя кірункі дзейнасці асобых аддзелаў партызанскіх фарміраванняў Баранавіцкай вобласці 7

Вялікі А. Ф. Этнапалітычны характар прызыву ў Чырвоную Армію і Войска Польскае ў заходніх абласцях Беларусі ў 1944—1945 гг. 10

Вінніца Г. Р. Халакост у Слуцкім раёне 13

Каспяровіч А. М. Грамадска-палітычнае жыццё тэхнікумаў Савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст. 18

Пілецкі В. А. Непазнанае ў змесце выхаваўча-адукацыйнага працэсу раннесярэднявечнага насельніцтва Беларусі 24

Груца І. А. Пачатак працэсу дэмаралізацыі Вялікай арміі і яго ўплыў на лёс маскоўскіх трафеяў (на этапе адступлення ад Масквы да мяжы з Беларуссю) 29

Пракаповіч Л. Э. Уплыў фабрычна-заводскай прамысловасці на сацыяльныя працэсы ў Беларусі ў XIX ст. 33

Пуцік У. С. Аграрна-сялянскія пытанні ў праграмах і дзейнасці партый і грамадскіх рухаў ліберальнага кірунку ў Беларусі (пачатак XX ст.) 36

Трубчык П. А. Нацыянальнае пытанне ў праграмах і дзейнасці сацыял-дэмакратычных партый у Беларусі ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. 43

Якаўчук В. І. Супрацьпажарная абарона беларускай вёскі ў першыя гады савецкай улады (1924—1930 гг.) 47

Варывончык І. В. Амерыканскі сярэдні клас і праблемы адукацыі ў канцы XX — пачатку XXI ст. 49

Філасофія

Кікель П. В., Абалевіч І. В. Матэматызацыя навукі і неабходнасць рэарганізацыі сістэмы адукацыі 55

Бліхарж Р. І., Вержыбок Г. У. Дамінанты метадалагічнай рэфлексіі ў навукова-даследчай дзейнасці 58

Кузняцоў А. У. Сацыяльная філасофія ў сістэме сучасных філасофскіх ведаў 64

Кузняцоў А. У., Кузняцоў В. У. Фарміраванне тэацэнтрычнай парадыгмы сацыяльных ведаў 69

Паліталогія

Грынёва В. М. Палітыка нейтралітэту і забеспячэнне калектыўнай бяспекі 76

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

брыгады імя Шчорса за час свайго існавання было ўзарвана 3 машыны, спушчаны пад адхон 1 эшалон, захоплены 8 «языкоў» і інш. [17, с. 123].

Для здзяйснення азначаных вышэй задач ствараліся дзве агентурныя сеткі. Першая, пра якую ўжо было згадана, утваралася ў раёнах дзеяння партызанскіх фарміраванняў і займалася разведкай, здзяйсненнем дыверсій, выяўленнем шпіёнаў і здраднікаў і складаннем іх спісаў. Сувязных і агентаў у партызанскія атрады вербавалі непасрэдна з дазволу ўпаўнаважаных ці кіраўнікоў асобых аддзелаў. Усе сувязныя і агенты давалі падпіску, што яны «сапраўды будуць працаваць як патрыёты на карысць Радзімы» [17, с. 122].

Напэўна, падобную падпіску давалі і агенты другой сеткі, якая ствараласяўнутры партызанскіх фарміраванняў. Мэтамі яе было выяўленне варожых агентаў, выпадкаў «антыпартызанскіх» паводзін байцоў і камандзіраў як у атрадзе, так і падчас выездаў у раён, а таксама назіранне за настроямі партызанаў. Унутрыатрадная сетка дапамагала тады, калі была дрэнна наладжана выхаваўча-палітычная праца: замест яе да ненадзейных ці маладых байцоў прыстаўляўся агент, які сачыў за іх паводзінамі, каб папярэдзіць дэзерцірства ці здраду [13, с. 67—70]. Кантроль над партызанамі павінен быў быць поўным, дзеля гэтага загадвалася насадзіць агентуру ўнутры брыгад з разлікам 1—2 чалавекі ў падраздзяленні (аддзяленне і вышэй) [11, с. 32].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што галоўнымі кірункамі дзейнасці асобых аддзелаў была контрразведвальная праца — пошук нямецкіх агентаў у атрадах і зонах дзеяння фарміраванняў і выяўленне асоб, што працуюць на акупацыйныя ўлады, а таксама расследванне антыпартызанскіх учынкаў і злачынстваў, вядзенне разведкі і здзяйсненне дыверсійных актаў. Для гэтага ствараліся дзве агентурныя сеткі: ў раёнах дзеяння і ў партызанскіх атрадах.

Літаратура і крыніцы

1. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3 т. Мн., 1983. Т. 1
2. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3 т. Мн., 1985. Т. 3
3. *Дамарад К. І.* Разведка і контрразведка ў партызанскім руху Беларусі 1941—1944 гг. Мн., 1995.
4. *Киселёв В. К.* Борьба партизан с подрывной деятельностью спецслужб в Белоруссии // Вопросы истории. 1984. № 3.
5. *Киселёв В. К.* Враг их боялся // Военные контрразведчики. Особым отделам ВЧК—КГБ 60 лет. Мн., 1978.
6. *Киселёв В. К.* Партизанская разведка (сентябрь 1943 — июль 1944 гг.). Мн., 1980.
7. *Мищенко Г. П., Мигрин Г. П.* Задача особой важности. Киев, 1985.
8. *Попов А. Ю.* Диверсанты Сталина. Деятельность органов Госбезопасности на оккупированной советской территории в годы Великой Отечественной войны. www.militera.lib.ru
9. *Попов А. Ю.* НКВД и партизанское движение. М., 2003.
10. *Попов А. Ю.* Партизаны и контрразведка в годы Великой Отечественной войны // Отечественная история. 2003. № 3.
11. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 3.
12. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 6.
13. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 12.
14. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 13.
15. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 18.
16. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 37.
17. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 207.
18. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 379.
19. НА РБ, ф. 1399, воп. 1, спр. 666.

Summary

This article is devoted to the main directions of work of the partisan counterespionage service in Baranavichi area. Structurally made out partisan formations as special departments counteracted the enemy agents, dealt with the criminals among partisans, organized the secret-service investigation and carried out acts of sabotage through their agents. For the realization of these tasks two networks of agents were created: the first within the partisan detachment itself and the other on the territory of the action of that detachment.

УДК 947.6 «1944/1945»

А. Ф. Вялікі

ЭТНАПАЛІТЫЧНЫ ХАРАКТАР ПРЫЗЫВУ Ў ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ І ВОЙСКА ПОЛЬСКАЕ Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСІ Ў 1944—1945 гг.

Летам 1944 г. Чырвоная Армія вызваліла Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аднак вайна яшчэ працягвалася, і адным з важнейшых мерапрыемстваў улад на вызваленай тэрыторыі стаў прызыў насельніцтва ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(РСЧА). У заходніх абласцях БССР склалася своеасаблівая сітуацыя: «канкурэнтам» Чырвонай Арміі выступіла Войска Польскае (ВП), створанае на аснове дэкрэта Краёвай Рады Нарадовай (КРН) ад 22 ліпеня 1944 г. аб аб'яднанні партызанскіх атрадаў Арміі Людовай з 1-й Польскай Арміяй [7, с. 186].

У сувязі з гэтым у заходніх абласцях Беларусі быў абвешчаны прызыў у ВП. Такім чынам, у заходнебеларускім рэгіёне фактычна праходзілі два прызывы: у Чырвоную Армію і Войска Польскае. Аднак, распачаўшы прызыўную кампанію, улады сустрэлі пратэст і нежаданне палякаў служыць у Чырвонай Арміі. Летам-восенню 1944 г. з ваенкаматаў заходніх абласцей Беларусі ў партыйныя структуры ўсіх узроўняў накіроўвалася інфармацыя аб ухіленні палякаў ад прызыву ў РСЧА. Так, загадчык аргінструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б В. Закурдаеў у спецпаведамленні «Аб становішчы ў Іўеўскім і Юрацішскім раёнах Баранавіцкай вобласці», накіраваным у жніўні 1944 г. сакратару ЦК КП(б)Б В. Маліну, адзначаў: «У Іўеўскім і Юрацішскім раёнах Баранавіцкай вобласці моцна распаўсюджаны нацыяналістычныя настроі. З моманту вызвалення тэрыторыі ад фашысцкіх захопнікаў нацыянальныя падпольныя арганізацыі правялі сярод палякаў агітацыю за непрызнанне савецкай улады. Пад уплывам гэтай агітацыі палякі ўхіляюцца ад мабілізацыі ў армію. Аб гэтым сведчыць факт, што ў гэтых раёнах ні адзін паляк у Чырвоную Армію не пайшоў. З мястэчка Іўе ў першыя дні было мабілізавана 300 палякаў, на шляху ў Ліду ўсе яны разыйшліся» [5, с.172].

У канцы жніўня гэтага ж года аргінструктарскі аддзел ЦК КП(б)Б падрыхтаваў даведку «Аб некаторых фактах антысавецкіх выступленняў і бандытызму з боку асобных груп насельніцтва ў заходніх абласцях БССР», у якой зноў падкрэслівалася, што ў Баранавіцкай вобласці (асабліва ў Лідскім раёне) маюцца выпадкі масавага адмаўлення ад прызыву ў Чырвоную Армію. У даведцы адзначалася: «Былі выпадкі, калі прызыўныя павесткі палякі тапталі нагамі, патрабавалі польскіх афіцэраў. Мелі месца выпадкі ўцёкаў у лес» [3, л. 116]. На прызыў у РСЧА істотна ўплываў фактар польскага падполля, якое не толькі забараняла палякам ісці ў Чырвоную Армію, але і ўжывала рэпрэсіі да тых сем'яў, у якіх мужчыны былі прызваныя ў армію. У запісцы «Аб палітычных настроях насельніцтва раёнаў Брэсцкай вобласці (кастрычнік 1944 г.)» падкрэслівалася: «Бандыты з мэтай зрыву мабілізацыі ў шэрагі РСЧА сталі забіваць сем'і сялян толькі за тое, што члены іх сямей служаць у Чырвонай Арміі. Так, 1 кастрычніка на хутары ў Павіцкім с/с быў забіты селянін толькі за тое, што яго сын служыў у Чырвонай Арміі» [3, л. 327]. Пагроза падполля восенню 1944 г. была настолькі моцнай, што многія палякі пазбягалі з'яўляцца на прызыўныя ўчасткі. Ва ўзгаданай запісцы падкрэслівалася: «Па вобласці (Брэсцкай. — *А. В.*) з 9117 чалавек прызыўнога ўзросту, прызвана ўсяго 6882 чалавекі» [3, л.328].

У адносінах да тых палякаў, якія ўхіляліся ад прызыву ў Чырвоную Армію прымаліся розныя захады ўздзеяння: ад правядзення тлумачальнай працы, да вышукання і прымусовага накіравання ў армію праз органы НКДБ [3, л. 225]. Выкарыстанне розных форм прыносіла свой плён. Так, у спецпаведамленні «Аб ходзе ўборкі ўраджаю і мабілізацыі ў Чырвоную Армію ў Жабінкаўскім раёне Пінскай вобласці» падкрэслівалася, што «ваенна-абавязаныя пачынаюць па 20—25 чалавек у дзень вяртацца на прызыўныя пункты ваенкамата. Напрыклад, на 20 жніўня з Паршавіцкага с/с амаль усе з'явіліся на прызыўны пункт» [3, л. 225]. Супраць тых, хто добраахвотна не выходзіў з лесу, праводзіліся вайскова-чэкісцкія аперацыі, і пасля праверкі захопленых людзей накіроўвалі на прызыўныя пункты ваенкаматаў. Так, аргаддзел ЦК КП(б)Б у жніўні 1944 г. адзначаў, што ў Лідскім раёне «з 10 па 30 кастрычніка 1944 г. аператыўнымі групамі затрымана ўхіляючыхся ад прызыву ў Чырвоную Армію 1217 чалавек» [3, л. 220].

З мэтай ухілення ад службы ва ўзброеных сілах СССР палякі патрабавалі, каб у ваенкаматах у чырвонаармейскіх кніжках іх запісвалі выключна палякамі, бо гэта давала магчымасць прызывацца ў Войска Польскае. Так, ваенны аддзел ЦК КП(б)Б у канцы снежня 1944 г., аналізуючы вынікі прызыўной кампаніі восені 1944 г., адзначаў, што толькі ў Маладзечанскай вобласці 743 чалавекі запісаліся палякамі з мэтай ухілення ад прызыву ў Чырвоную Армію» [6, с. 13].

Адмаўляючыся служыць у РСЧА, палякі масава выказвалі жаданне служыць у Войску Польскім. Так, Гродзенскі абком партыі паведамляў у ЦК КП(б)Б (лістапад 1944 г.), што «мабілізацыя ў Чырвоную Армію ў г. Гродна праходзіла нездавальняюча, галоўным чынам за кошт польскага насельніцтва. У шырокіх памерах мела месца нез'яўленне палякаў на мабілізацыйныя пункты. Аднак, калі мабілізаваных палякаў пачалі накіроўваць на фарміровачныя пункты ў Польшчу, адносіны палякаў да мабілізацыі рэзка змяніліся. За-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мест ухілення і дэзерцірства ў гарваенкамат сталі прыходзіць добраахвотна са зваротамі залічыць іх у Польскую Армію (да 50 чалавек штодзённа)» [4, л. 62]. Аналагічная сітуацыя склалася і ў шэрагу раёнаў Маладзечанскай вобласці. Начальнік Свірскага РА НКДБ адзначаў, што «большасць моладзі раёна пайшла ў Польскую Армію, а не ў Чырвоную» [1, с. 95].

Чаму палякі заходнебеларускага рэгіёну ўхіляліся ад прызыву ў Чырвоную Армію і намагаліся трапіць у Войска Польскае? Галоўнай прычынай такой сітуацыі з'яўлялася наступнае. Усе жыхары Заходняй Беларусі ў адпаведнасці з Законам «Аб грамадзянстве СССР» ад 19 жніўня 1938 г. і Указам Прэзідыума ВС СССР ад 29 лістапада 1939 г. набылі грамадзянства СССР» [2, с. 84]. Аднак гэты фармальны акт яшчэ не сведчыў, што сотні тысяч палякаў ў сапраўднасці лічылі сябе грамадзянамі СССР. Наадварот, большасць з іх заставалася перакананымі прыхільнікамі Другой Рэчы Паспалітай, не жадала жыць у Беларусі і марыла аб пераездзе ў Польшчу. Аднак магчымасць набыць польскае грамадзянства, а значыць пераехаць у Польшчу, дазваляла пастанова СНК СССР ад 22 чэрвеня 1944 г. «Аб праве перахода ў Польскае грамадзянства ваеннаслужачых Польскай арміі ў СССР і асоб, дапамагаючых ёй у барацьбе за вызваленне Польшчы, а таксама членаў іх сямей» [7, с. 138]. У адпаведнасці з гэтай пастановай, палякі заходніх абласцей Беларусі, якія з'яўляліся ваеннаслужачымі польскай арміі ў СССР ці раней былі ў яе радах, а таксама палякі, якія садзейнічалі польскай арміі ў барацьбе за вызваленне Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, атрымоўвалі права набыцця польскага грамадзянства. Улічваючы гэты фактар, становіцца зразумелым жаданне палякаў служыць не ў Чырвонай Арміі, а ў Войску Польскім.

Нягледзячы на складанасці прызыву, летам—восенню 1944 г. у Чырвоную Армію з усіх абласцей Беларусі, у тым ліку і з заходніх, было прызвана 564 475 чалавек. У гэты ж час з заходніх абласцей БССР у Войска Польскае прызвалі 44 115 чалавек» [6, с. 11].

Частка прызыўнікоў-палякаў з заходніх абласцей БССР трапіла ў Чырвоную Армію супраць іх волі і жадання. Гэта спарадзіла глыбокі нацыянальны канфлікт. Прызыўнікі-палякі адмаўляліся прымаць прысягу, патрабавалі, каб у ваенных білетах іх запісвалі палякамі і адпраўлялі ў Войска Польскае. Так, у пачатку снежня 1944 г. палітаддзел 19-й арміі 2-га Беларускага фронту адзначаў: «Прыбыўшыя ў 27-ю стралковую дывізію (СД) 160 чалавек — усе з заходніх абласцей Беларусі. З іх 31 чалавек служылі раней (6 месяцаў) у старой польскай арміі. Астатнія ў арміі ніколі не служылі. 3 чалавекі — Кетойс В., Ветрыс М. і Страх В. — адмаўляліся браць чырвонаармейскія кніжкі, выпісаныя ім у запасным палку, матывіруя гэта тым, што яны па нацыянальнасці палякі, а ў чырвонаармейскіх кніжках запісалі, што яны беларусы. Прыбыўшыя ў 18-ю СД звярталіся да кожнага афіцэра, які размаўляў з імі, аб тым, каб іх накіравалі служыць у польскую армію. 32 палякі падалі аб гэтым калектыўную заяву» [8, с. 144].

22 снежня 1944 г. палітаддзел 19-й арміі зноў падрыхтаваў запіску па фактце заявы 32-х палякаў аб нежаданні служыць у Чырвонай Арміі. У ёй падкрэслівалася: «Усе, падпісаўшыя заяву, сцвярджаюць, што яны палякі і што ў ваенкамаце па месцы прызыву (Заходняя Беларусь. — *А. В.*) яны значыліся палякамі. Па прыбыцці ў 391-ы запасны полк ім былі выпісаныя чырвонаармейскія кніжкі, у якіх яны запісаны беларусамі. Знаходзячыся ў 391 палку яны адмовіліся атрымоўваць чырвонаармейскія кніжкі. Многія з іх раней служылі ў польскай арміі і давалі прысягу, а цяпер лічаць, што, прысягаючы Чырвонай Арміі, яны здрадзяць Богу і польскаму народу. Баец Маркоўскі Браніслаў заявіў: «У ксёнжках у райваенкамаце пісалі, што мы палякі, а тут напісалі — беларусы. Навошта топчуць нашую нацыю. Неабходна, каб чырвонаармейская кніжка была аформлена правільна, тады яе возьмем» [8, с. 147]. Палітаддзел таксама адзначаў, што важнымі матывамі, якія вымушалі прызыўнікоў-палякаў адмаўляцца ад службы ў Чырвонай Арміі, з'яўляліся наступныя: нежаданне быць грамадзянінам СССР, варожасць да калгасна-саўгаснай сістэмы, рэлігійны ўціск і інш. [8, с. 148].

Як вынікае з вышэйадзначанага, галоўнай прычынай адмаўлення служыць у Чырвонай Арміі выступалі менавіта этнапалітычныя фактары. Заявы: «Мы палякі», «Навошта топчуць нашую нацыянальнасць», «Прысяга ў Чырвонай Арміі — гэта здрада Богу і польскаму народу», «Мы — грамадзянне польскай дзяржавы» і г. д. сведчылі аб высокім нацыянальным пачуцці, усведамленні сябе этнічнымі палякамі і грамадзянамі II Рэчы Паспалітай.

Адкрытае выступленне прызыўнікоў-палякаў з заходніх абласцей БССР мела сумныя вынікі для тых, хто адмаўляўся служыць у Чырвонай Арміі. Арганізатар падачы заявы А. Кокштыс быў арыштаваны органамі СМЕРШ, а астатнія палякі размеркаваны паасобку ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

розных аддзяленнях, каб не маглі збірацца разам. Больш таго, ім заявілі, што яны з'яўляюцца савецкімі грамадзянамі і будуць служыць у Чырвонай Арміі [8, с.149].

Адзначым, што ўсё ж большасць прызыўнікоў-палякаў заходнебеларускага рэгіёну пад уздзеяннем моцнай прапагандысцкай «апрацоўкі», запалохвання, пагроз была вымушана прыняць ваенную прысягу і служыць у Чырвонай Арміі. Разам з тым асобныя прызыўнікі-палякі, нягледзячы ні на якія пагрозы, адмаўляліся прымаць прысягу. Так, 5 чалавек — Мацук, Маўчан, Аўсянік, Станкевіч і Багдановіч — заявілі: «Прысягу больш прымаць не будзем. Мы прысягалі адзін раз перад польскім народам і Богам. Здраднікамі Радзімы не будзем» [8, с. 150].

Такім чынам, прызыў у РСЧА і Войска Польскае ў заходніх абласцях Беларусі ў 1944—1945 гг. праходзіў у надзвычай складаных абставінах, абумоўленых перш за ўсё этнапалітычнымі фактарамі. Гэтыя людзі адносілі сябе да палякаў, грамадзян Польшчы, якім уласцівы высокае пачуццё нацыянальнай свядомасці, што вымушала прызыўнікоў-палякаў адмаўляцца ад службы ў Чырвонай Арміі і намагацца трапіць служыць у польскую армію. Аднак такая пазіцыя ставіла палякаў перад надзвычай складаным і няпростым выбарам — уступаць націску паліторганаў, спецслужбаў, адмаўляцца ад сваёй нацыянальнай прыналежнасці і «пераўтварацца» ў беларуса (гэта адзначала немагчымасць набыцця польскага грамадзянства і пераезду ў Польшчу), ці, наадварот, цвёрда трымацца свай нацыянальнай прыналежнасці, адмаўляцца служыць у Чырвонай Арміі і патрабаваць пераводу ў Войска Польскае. Аднак гэта пазіцыя вяла да арыштаў, праследаванняў расследу, рэпрэсій з боку спецслужбаў у дачыненні тых, хто яе прытрымліваўся.

Магчыма меркаваць, што ўсё ж большая колькасць палякаў, якія трапілі ў Чырвоную Армію, выбралі першы шлях. Зараз цяжка ўстанавіць і вызначыць колькасць другой групы — «адказнікаў» — і прасачыць іх лёсы. Дакументальныя матэрыялы аб прызыўной кампаніі 1944—1945 гг. у заходнебеларускім рэгіёне знаходзяцца ў архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі і іх вывучэнне, аналіз дадуць магчымасць больш глыбока даследаваць узгаданую тэму.

Літаратура і крыніцы

1. *Вялікі А. Ф.* На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944—1946) : манаграфія / навук. рэд. В. Дз. Селяменеў. Мн., 2005.
2. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дак. і матэрыялаў (чэрвень 1941 — жнівень 1945 г.) / склад. М. М. Дзятчык [і інш.]. Мн., 2001. Т. 4
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ), ф. 4, воп. 42, спр. 245.
4. НА РБ, ф. 4, воп. 42, спр. 375.
5. Освобождённая Беларусь : док. и материалы. В 2 кн. Кн.1. Сентябрь — декабрь 1944 г. / сост. В. И. Адамушко [и др.] Мн., 2004.
6. Освобожденная Беларусь: док. и материалы. В 2 кн. Кн. 2. январь — декабрь 1945 г. / сост. В. И. Адамушко [и др]. Мн., 2005.
7. *Персаданова В. С.* Советско-польские отношения в годы Великой Отечественной войны. 1941—1945. М., 1982.
8. *Сенявский А.* Поляки в Красной Армии в 1944 г.: социально-психологические проблемы // Генацыд у Другой сусветнай вайне. Праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца) : матэрыялы Міжнар. навук. канф. г. Мінск, 25—27 верас. 2002 г. Мн., 2003.

Summary

The article deals with the problem of recruting Poles from Western region of Belarus to the Soviet ary and Polish armies and reflects the political, national, ethnic, religious factors which influense on that process. Recruting Poles to the Soviet army lead to great ethno-political conflict between Poles and the commander of Soviet Army Brigade.

УДК 947.6(476.1)

Г. Р. Вінніца

ХАЛАКОСТ У СЛУЦКІМ РАЁНЕ

Першая згадка аб пражыванні яўрэяў у Слуцку сустракаецца ў пісьмовых крыніцах з 1583 г. [1]. Да пачатку XVII ст. у горадзе фарміруецца грамада. У XVII ст. літоўскі Ваад прызнаў яўрэйскую грамаду Слуцка галоўным кагалам адной з пяці абласцей, на якія дзялілася яўрэйская аўтаномія ў Вялікім княстве Літоўскім. У XVIII ст. гарадская грамада становіцца адной з найбольш буйных і ўплывовых у ВКЛ. Да 1766 г. колькасць слуцкіх яўрэяў дасягнула 1577 чал. На працягу XIX ст. колькасць яўрэйскага насельніцтва працягвала павялічвацца, стабільна складаючы 71 % ад агульнай колькасці жыхароў. Так, калі ў 1800 г. у горадзе пражывала 1584 яўрэі, то ў 1897 г. — 10 264. Яўрэі займаліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ